5. *Куликов, С. С.* Тестирование программного обеспечения. Базовый курс: практ. пособие / С. С. Куликов. – Минск : Четыре четверти, 2015. – 294 с.

6. *Тамре, Л.* Введение в тестирование программного обеспечения = Introducing Software Testing / Луиза Темпре ; [пер. с англ. и ред. А. В. Слепцов]. – М. : Вильямс, 2003. – 368 с. : ил.

7. *Чипига, А. Ф.* Информационная безопасность автоматизированных систем : учеб. пособие / А. Ф. Чипига. – М. : Гелиос АРВ, 2010. – 336 с. : ил.

8. *Шаньгин, В. Ф.* Информационная безопасность компьютерных систем и сетей : учеб. пособие / В. Ф. Шаньгин. – М. : ФОРУМ : ИНФРА-М, 2014. – 416 с. : ил. – (Профессиональное образование).

***А. М. Пісарэнка,***
*кандыдат філалагічных навук,*
*загадчык кафедры беларускай філалогіі*
*і сусветнай літаратуры*

## ЛІТАРАТУРНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ЯК СПОСАБ САМАРЭАЛІЗАЦЫІ АСОБЫ: АНАЛІЗ ДЗЕЙНАСЦІ АБ'ЯДНАННЯ «БУКЕТ»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратурна-творчае аб'яднанне «БУКет» было створана пры кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры БДУКМ у кастрычніку 2001 года. Яго арганізатары – А. М. Пісарэнка (паэт, член СПБ Алена Багамолава) і старшы выкладчык Н. В. Дзянісава (літаратурны крытык, член СБП Наталля Якавенка). З 2004-га да працы актыўна далучылася старшы выкладчык В. В. Шунейка, апошнім часам літкансультантам аб'яднання сталі таксама прафесар В. С. Варапаева, старшы выкладчык Л. І. Даніленка. Восенню 2008 года аб'яднанне было пераведзена на студэнцкае самакіраванне. Новым кіраўніком стаў студэнт ФІДК (цяпер супрацоўнік аддзела менеджменту якасці) Павел Макееў, а ўвосень 2015-га кіраўніком аб'яднання быў абраны студэнт ФТБКіСМ Уладзімір Сергіенка.

Вынікам працы аб'яднання сталі 10 зборнікаў вершаў і прозы: «БУКет», «Акварэлі», «Завіруха кропель», «Каліва», «Кветка ў мегаполісе», «Дар зямны», «Весніцы», «Світальныя словы», «Ляці Вышэй!», «Вітаю цябе, Натхненне!». Апрача таго, творы «букетаўцаў» неаднаразова друкаваліся і друкуюцца ў рэспубліканскіх газетах «Літаратура і мастацтва», «Наша слова», часопісах «Маладосць», «Літаратурны квартал», «Альфа-

бэт», «Верасень», «СБ». Удзельнікі аб'яднання прадстаўляюць сваю творчасць на рэспубліканскіх і міжнародных паэтычных конкурсах («Фестываль аднаго верша», «Песня натхнення», «Жураўлі над Расіяй», Міжнародны конкурс рускамоўнай паэзіі ў Рыме), становяцца іх лаўрэатамі і пераможцамі.

Сябры літаратурнага аб'яднання «БУКет» актыўна ўдзельнічаюць у культурных мерапрыемствах універсітэта і за яго межамі: святкаваннях Дня роднай мовы, Дня ФІДК, Дня славянскага пісьменства і культуры і Года кнігі ў Рэспубліцы Беларусь. Да юбілеяў класікаў беларускай літаратуры аб'яднанне рыхтуе тэатралізаваныя пастаноўкі («Быў. Ёсць. Буду» па матывах аповесці «Ладдзя роспачы» і паэзіі У. Караткевіча, «Песня на сон у бяссонне» па творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа, «Слова – усяго аснова. Душа крылатая ў слова» па творчасці Р. Барадуліна і інш). На сённяшні дзень літаратурнатворчае аб'яднанне «БУКет» налічвае звыш 20 чалавек, сярод якіх – студэнты ўсіх факультэтаў БДУКМ, выкладчыкі і супрацоўнікі ўніверсітэта. Аб'яднанне працягвае актыўную творчую дзейнасць па пошуку новых талентаў, новых формаў работы з прыцягненнем прадстаўнікоў іншых творчых аб'яднанняў і вядомых беларускіх літаратараў у якасці літкансультантаў і крытыкаў.

Літаратурная творчасць была і застаецца адной з магчымасцяў рэалізацыі здольнасцяў асобы, нестандартнага асваення рэчаіснасці, спасціжэння свету. Лёгка і адначасова няпроста ўбачыць у пялёстках кветкі крылы, у вачах – ззянне зор, у лісці, што зрывае з дрэў бязлітасны вецер, – хвалі... Сапраўдны творца мысліць вобразамі, адчувае сэрцам. Твор нараджаецца тады, калі сэрца аўтара б'ецца ва ўнісон з подыхам ветру, з ноткамі голасу маці, каханага, смеху дзіцяці, з шапаценнем лісця і пялёсткаў язміну каля роднага ганка, з першым гудком ранішняга трамвая… Над усімі гэтымі з'явамі і праявамі жыццялёсу асобы – Бог, які любіць, Бог, які апякуецца. І той, хто верыць ва Усявышняга, хто давярае яму, – мае спакой, гармонію, супакаенне. Аднак з тропу лёгка збіцца, і тады на дапамогу прыходзіць малітва да Бога: *Пишу письмо... не на бумаге, без чернил... / Словами веры строки вырастают, / Молитву бережно в конверт сложив, / С печалью в сердце к Богу отсылаю... (Ю. Коўшык).* Адкуль смутак у сэрцы сучаснага, у тым ліку маладога, пакалення, разгубленасць: *А за окном тем-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*ным-темно, / Да и на сердце точно так же (К. Супранок);* у чым шукаць выйсце: *Дапамажы нам, Божа, / Дапамажы і падкажы: / Што самае галоўнае / На небесі і на зямлі... (А. Багамолава).* Выйсце, безумоўна, ёсць заўсёды. Духоўнасць натхняе на чысціню памкненняў, думак, учынкаў. Духоўнасць – уменне бачыць прыгажосць, духоўнасць – гэта любоў ва ўсіх яе праяўленнях: да Радзімы, да бліжняга, да жыцця… Любоў – як зорка, у якой *тысячи живых лучей / Всё озаряли сумрачное небо, / А в глубине морской / Рождались звёзды... (В. Варапаева).* Сапраўды, калі жыццялёс раптам уявіўся чалавеку няпростым, "сумрачным небом", выратаваць можа Любоў… З гэтым пачуццём чалавек нараджаецца, павінен жыць і пераходзіць у іншы свет… Тады толькі можна адчуць *жаркий август, что не щадит* і *дождливый ненастный апрель (В. Шарсцінава)*, убачыць і пачуць, як *На марозе звёзды не звенят устало, / Повторяют эхом: «Баюшки-баю», / В облаках ванильных, сон твой сберегая, / Напевают тихо песенку мою (В. Шарсцінава).* Чалавек можа ўбачыць сам і падарыць бліжняму хаця б імгненне радасці, хвіліну прыгажосці праз паэтычныя радкі: *Пробудись, о весеннее солнце! / Пробудись! И яви благодать! / Я люблю, когда в наше оконце / Заплывает лучистая рать. / Я люблю, когда дождик осенний / Сыплет Божий горох по лугам / И несметные орды растений / Устремляются ввысь к облакам (А. Лукшыц).*

О Паэзія! Якое шырокае і магутнае тваё крыло!.. Пад гэтым крылом нікому не будзе цёмна і самотна! У паэтычным свеце адбіваецца жыццё: *Солнце – за тучами, счастье – за горем. / И не разделит социум нас, не расколет (А. Новік).* Менавіта Паэзія, таксама, як малітва да Бога, як слова сябра, вяртае да жыцця: *Очнись! Мы живём, чтобы жить, / Перед большими победами – мелкие шаги (А. Новік); Людзі, дзе б вы ні хадзілі – / Па асфальце ці раллі, / Пабудуем рай нябёсны / Тут, на сонечнай зямлі! (Л. Даніленка); Люби, / Поверь / Найди / Свой ключик к облакам. / Смотри, / Живи, / Учись / Бывать самим собой. / Лети, / Борись, / Стремись / Стать светлою звездою (А. Ірэальны).*

Вершаванае слова моладзі перасцерагае нас, прымушае задумацца над марна патрачаным часам, аб хуткасцях і адлегласцях, якія не дазваляюць вымяраць вагу здрадніцтва і дабрыні. Трэба спыніцца, каб у каламуці дзён не згубіць духоўнасць…

*Мы вытираем о пороги / сначала день, а после – век; мы жить спешим, спеша куда-то. / Ну кто мы жизни? Кто мы ей? / Мы – просто встречный-поперечный / На шахматной доске земли. / Мы – жили-были. Мы не вечны. / Пришли – и навсегда ушли (К. Супранок).*

Асэнсаванне розных перыпетый жыцця выклікае розныя вобразы. Калі адзін звоніць у званы пра тое, як *по бездонному океану... / Люди мчатся галопом, бегом...* і далей *Друг, как хищник, идёт на друга, / Поражая смертельным мечом! (Ю. Коўшык),* то іншыя ўсё ж, перайшоўшы мяжу цемра – святло, вераць у тое, што магчыма *В былое не смотря, вперёд идти. / Тропу к вершинам гор найти. / Сорвавшись вниз, наверх ползти. / Всё потеряв – вновь обрести; / Всех хищников там обойти... / Сомненья, страхи кинув прочь, / Волку, попавшему в капкан, помочь (А. Камбураки).*

Хто дапамагае ўтрымацца ў натхненні, не разгубіцца і не згубіцца ў свеце і ў Сусвеце? Анёлы – ахоўнікі нябёсныя і зямныя, кожнаму Богам дадзеныя. У некага гэта маці, у некага – дзіця, сябра ці, можа, нават сама Радзіма і, безумоўна, вера: *Анёлы, / Трымаю вас я на руцэ... / Трымаюся за вас... (А. Багамолава); Спи, мой ангел, я рядом с тобой. / Пусть меня ты даже не видишь. / Завтра снова вступлю в бой с луной, / Чтобы знать, что спокойно ты дышишь (В. Шарсцінава); На купалах царкоўных і касцельных вежах / Іскрыліся ўзоры зораў снежных. / Ды на крыжах магільных шапкамі бялелі, / Як попел сэрцаў, што за Беларусь балелі (Н. Волкава); У чорна-белым фраку, у чырвоных ботах, / Над Беларуссю бусел дзетак нам нясе; Адчуваю цеплыню тваіх далоняў, / Бачу снег, што засцілае скроні, / Мне на свеце трэба вельмі мала: / Будь заўжды са мною, мама!.. (Л. Даніленка); Мне хочется просто верить, без веры никак... Мне хочется верить: есть справедливость на свете, / И если нам сегодня плохо, завтра будет солнце, поверьте (А. Новік)*. Кожнаму – па веры яго, бо сілай веры можна напалохаць сумневы дня і беспрытульнасць ночы (*А. Багамолава*), а, як вядома, асіліць дарогу той, хто ідзе: *Усявышні кожнага натхняе жыць, / і Нам даруе сілы Бог! (А. Багамолава).*

Дзясяты зборнік «Вітаю цябе, Натхненне!», выданне якога прымеркавана да 40-гадовага юбілею ўніверсітэта і 70-годдзя Вялікай Перамогі, яшчэ раз пацвярджае шматграннасць тален-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ту маладога пакалення, у прыватнасці, сённяшніх студэнтаў і выпускнікоў БДУКМ. Разнастайныя па змесце і па форме творы закранаюць розныя тэмы: Радзімы, вайны, кахання, узаемаадносін чалавека з чалавекам, чалавека і Бога і інш. Тут не мае значэння, у форме казкі ці верша, замалёўкі ці дыярыушу напісаны твор. Важна тое, як праз прызму пачуццяў, бачання маладых адлюстроўваюцца свет і Сусвет, а разам з тым раскрываецца асоба. Вобразныя сродкі, як правіла, тропы, выяўляюць непаўторныя асацыяцыі чалавека. Напрыклад, вастрыня аўтарскіх пачуццяў у прааналізаваных тэкстах праяўляецца праз **антытэзы**: *Ты вспомнишь, как я* ***плакала, смеясь****, / И как* ***смеялась*** *– только со* ***слезами****; / И* ***появлялась*** *–* ***как из-под земли****, / А* ***уходила*** *через окна –* ***к звёздам*** *(Астрадэні)*; *Прошло… Времена другие. / Как будто другой и мир. /* ***По-новому*** *все* ***кроили****, / Да кто-то* ***по-старому сшил****… (Д. Качан); Няма на зямлі* ***ні святла, ні радасці****, /* ***ні тугі, ні адчаю****... (Я. Лайкоў); Цела і душа – на скрыжаванні. / Дзе цябе шукаць? Куды глядзець? /* ***Цёплым*** *сном забыцца без світання / Ці* ***халодных*** *промняў боль цярпець? (П. Макееў).*

Прадуктыўнымі і арыгінальнымі, аказіяльнымі, яркімі ў мастацкіх тэкстах з'яўляюцца разнастайныя тропы, але найперш гэта:

**метафара**: ***Чернила времени высохли****. / Извините, писатели, / За те недописанные сочинения, / Ждали которых многие (К. Бакулін);* ***Чародка блакітных лябёдак / Сумуе за люстрам-акном*** */ Ракі, што ніколі не будзе / Цяпер па-старому цячы (К. Бандзерс); Не спіца ўночы: /* ***людская зайздрасць_/ з'ядае каханне старымі зубамі****... (В. Бялова);* ***Земля чужая заберет, проглотит*** *тех, кто пал. / Холодную* ***землю снаряды терзали****, / И* ***воздух трещал*** *над его головой (Г. Вярэніч); Если кто-то и был виноват… / Непрочитанных мною* ***стихов рукописная россыпь****; Шматтмоўе: /* ***Шматкроп'е позіркаў****, /* ***Пункціры дотыкаў****, /* ***Працяжнік маўчання****. /* ***Новыя сузор'і / Нараджаюцца ў кутках вуснаў*** *(Н. Кузміч);* ***Молчит*** *луна, а* ***небо понимает****, /* ***Что стала ты на звёздочку взрослей****; /* ***Горят огни*** *слегка потухших* ***улиц****. / Сон в тишине, и* ***свечкам спать пора*** *(Я. Лецко);*

**эпітэт**: ***Горбатый город****… / Природа: море, лес. / И* ***горе-дождь*** *среди небес (К. Балацько);* ***Зачыненымі дзвярыма*** */* ***Расчыненае чаканне*** */* ***Гаворка ў_кішэні корка*** *(К. Бандзерс);*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*У восеньскім ранку / **з акварэльна-дажджовым** / **настроем** / схаваліся вершы / за пабудовамі мегаполісу (В. Бялова); Над рекой **лохматый** плыл **туман** (Г. Вярэніч); І для іх не раўня / **Жаўтабокае сонца** (Я. Казлоўская); У люстэрках лужын воблакі плылі / **Да першага-апошняга спаткання** (Я. Лецко); Я **краской** на холсте оставлю след, / **Волшебной**, чтобы ярко было (Л. Рудзік); Солнце уже почти спряталось за горизонтом, на небе появились **звезды-модницы** (У. Сергіенка);*

__**перыфраза**__: ***Она** была **душой поэта,** / **Русалкой берега мечты** (Т. Бубновіч); **Вусны – шоўку ласкут** (Я. Казлоўская); **Сонца – маці майго адзінокага сэрца** – на захадзе спеліць пажыры; ...**бялёсыя, пульхныя дзеці – ссамотнелыя аблачыны** (Я. Лайкоў); **Я**, как прежде, живу среди вас – / **Чуждый странник елейного мира**. / На земле **я забытый цветок,** / Поливать и окучивать смеет / Меня только всевидящий Бог, / Что нас всех, глядя сверху, лелеет (А. Лукшыц); Што **твае вокны**...? **Не больш чым слабасць.** / **Мой боль прыціхлы**, **мая журба**. / **Майго чакання сляпая радасць,** / Гадзіна лёсу майго адна (К. Нарваткіна);*

__**параўнанне**__: ***Гарлачыкам развінецца здзіўленне,** / калі з самай высокай званіцы, / асляпіўшы абсяг на імгненне, / **нібы вогненны боль_навальніцы**, / **бог святла долу** зрынецца ніцма (Я. Лайкоў); И **чайки**, как_**нелепая затея,** болтались в воздухе, о чем – неясно, плача (А. Свечнікава); **Завязана Молитва** / На пульсе метроритма: / Мелодией, **незрелыми стихами.** / Не разобрав дорогу, / Летит на встречу к Богу / **Бумажной птицей в стиле оригами** (В. Абаніна).*

Відавочна, усе вобразныя сродкі, прыведзеныя ў адпаведных кантэкстах, маюць аказіянальны змест, а часам і форму. Гэта азначае, што маладыя аўтары мастацкіх тэкстаў, абраўшы такую форму самарэалізацыі, Маюць нестандартнае, творчае мысленне. Унутранае «я», якое праяўляецца праз мастацкія вобразы, заслугоўвае пільнай увагі з боку літкансультанта. Магчыма, некаторыя з «букетаўцаў» стануць членамі СПБ, як, напрыклад, А. Шостак, В. Гронская і інш.

…Творцамі не становяцца – творцамі нараджаюцца! – сцвярджаюць выкладчыкі кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры самай творчай ВНУ краіны. У нас самыя творчыя студэнты! Уявіце сабе, што мастакі, рэжысёры, музыкі, спевакі, бібліятэкары, менеджары не толькі спяваюць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

малююць, танцуюць, але і пішуць апавяданні, вершы, казкі, песні на высокім мастацкім узроўні!

«БУКет» чакае сваіх сяброў: судакраніцеся з нашай творчасцю, тварыце самі!

***А. В. Полянская,***
*кандидат медицинских наук, доцент,*
*доцент 2-й кафедры внутренних болезней,*
*УО «Белорусский государственный медицинский университет», г. Минск*
***Я. Л. Мархоцкий,***
*кандидат медицинских наук, профессор,*
*профессор кафедры физического воспитания и спорта БГУКИ*

# РОЛЬ КУЛЬТУРНЫХ ТРАДИЦИЙ НАСЕЛЕНИЯ БЕЛАРУСИ В ПРОФИЛАКТИКЕ ЗАБОЛЕВАНИЙ ПИЩЕВАРИТЕЛЬНОЙ И СЕРДЕЧНО-СОСУДИСТОЙ СИСТЕМ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

За свою многовековую историю белорусский народ создал уникальную самобытную культуру. Традиционные народные праздники и обряды сочетаются с христианскими традициями и образуют неповторимый гармоничный синтез. Белорусский народ выделяется своей оригинальной самобытной культурой, корни которой уходят в далекую языческую, дохристианскую, эпоху.

Белорусская культура – это часть общерусской культуры, ее самобытная и полноправная ветвь. Крестьянская белорусская кухня вплоть до конца XIX – начала XX вв. стойко сохраняла свои самобытные черты, уходящие корнями в XIII–XIV века. К концу XIX века белорусская кухня обрела свою самостоятельность.

Часто используются в белорусской кухне различные виды «черной муки» – овсяной, ржаной, ячменной, гречневой и гороховой, причем для хлеба в Беларуси шла ржаная мука, а для всех других мучных изделий – овсяная.

Другой особенностью использования муки является весьма частое смешивание различных ее видов, подмес к какому-либо основному виду муки (ржаной, овсяной) ячменной, гречневой